Серыя «Беларускія жыццяпісы»

*Андрэй Вашкевіч*

# Вінцэнт Гадлеўскі

## Насуперак часу

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2018

УДК 94(476)(094)+929Гадлеўскі
ББК 63.3(4Беи)
В23

*Серыя заснавана ў 2018 годзе*

**Вашкевіч, А. Ф.**
В23 Вінцэнт Гадлеўскі : насуперак часу / Андрэй Вашкевіч. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. — 188 с., [12] л. іл. : іл. — (Серыя «Беларускія жыццяпісы». Вып. 1).
ISBN 978-985-7165-57-5.

Імя Вінцэнта Гадлеўскага (1888–1942) добра вядома ўсім, хто цікавіцца беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам першай паловы XX ст. Гэты чалавек быў не толькі адным з лідараў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі — самай уплывовай незалежніцкай арганізацыі Заходняй Беларусі міжваеннай эпохі, але і на ўласным прыкладзе паказваў жыхарам вёсак і мястэчак іх права ўжываць у касцёле родную мову.

Біяграфія Вінцэнта Гадлеўскага створана на падставе дэтальнага даследавання разнастайных дакументаў, успамінаў і матэрыялаў перыядычнага друку. Аўтар арганічна ўпісаў дзейнасць святара ў шырокі кантэкст драматычнай эпохі, калі беларусы ўпершыню заявілі аб сваім праве на нацыянальную дзяржаўнасць. Яго жыццёвы шлях падрабязна апісаны ад нараджэння ў вёсцы Шурычы, што пад Ваўкавыскам, да трагічнай смерці ў Трасцянецкім лесе пад Мінскам.

**УДК 94(476)(094)+929Гадлеўскі**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-7165-57-5**

© А. Ф. Вашкевіч, 2018
© Афармленне. Выдавец А. М. Янушкевіч, 2018

І прыйдзе новых пакаленняў
На наша месца грамада
Судзіці суд, ці мы сумленна
Жыццё прайшлі, ці чарада

Зняваг мінулых нас не з’ела,
Пакінуўшы свой дым і чад,
І мы па-даўняму нясмела
Жылі не ў лад і неўпапад?

Ці аб свой гонар дбайна дбалі,
І добраахвотна, без прынук,
Самі сабой не гандлявалі,
Не неслі ў петлі дум і рук?

І ці пакінуці на памяць
Мы песень гэтакіх змаглі,
З якіх бы можна было ўцяміць,
Што мы свабоднымі былі?..

*Янка Купала, 1926 г.*

# ПРАДМОВА

У канцы «нулявых» мы з сябрам вырашылі паехаць на Свіслаччыну, у вёску Шурычы, пашукаць слядоў Вінцэнта Гадлеўскага і пагаварыць з тымі, хто яго памятаў. Такіх людзей мы там знайшлі. Пахадзілі па пустой, перарobленай у цяслярную майстэрню хаце Гадлеўскіх, а пасля паехалі ў Поразава, цэнтр парафіі, каб паспрабаваць адшукаць магілу бацькі ксяндза — Яна Гадлеўскага. Па немалых поразаўскіх могілках мы блукалі амаль гадзіну, магілу так і не адшукалі (ці захавалася яна наогул?), але перадумалася тады шмат. І пра тое, як мясцовы святар-паляк не дазволіў ксяндзу Гадлеўскаму, свайму «брату ў Хрысце», з'есці вячэру разам са святарамі з мясцовага дэканата, і Гадлеўскі пайшоў на магілу да свайго бацькі; і пра кулямёт на ганку касцёла ў Жодзішках, які паставілі там мясцовыя паліцыянты, каб разагнаць няўдалы «моўны плебісцыт»; і пра памятную дошку Гадлеўскаму, якую ў 2008 г. не дазволілі павесіць у жодзішкаўскім касцёле. Таксама я ўзгадаў, як старэнькі закрыстыян з Жодзішак па прозвішчы Рогач стукаў кульбай па зямлі і казаў: «А хай бы павесілі гэтую шыльду Гадлеўскаму, хай бы павесілі, бо я памятаю, як ён казаў нам летам 42-га пра незалежную Беларусь...»

Доўгія гады незалежная Беларусь была толькі марай. І сам Вінцэнт Гадлеўскі, і многія іншыя заплацілі за гэтую мару

вельмі дарагую цану, але яна не памерла і дала свой плён. Тады, на могілках у Поразаве, я зразумеў, што некалі напішу кнігу пра ксяндза і яго запаветную мару.

Асобу Вінцэнта Гадлеўскага даследуюць мала. У Савецкай Беларусі пра тых, хто ў гады вайны супрацоўнічаў з немцамі, пісалі толькі ў прапагандысцкіх брашурах, хаця ў даваенны час Вінцэнт Гадлеўскі заслужыў у савецкай прэсе некалькі станоўчых водгукаў як святар, які змагаўся з «белапольскай акупацыяй» Заходняй Беларусі. Эмігранты Гадлеўскага збольшага хвалілі, але, на жаль, ні праслаўленне асобы Вінцэнта Гадлеўскага аднымі, ні ганьбаванне другімі не стала стымулам для вывучэння біяграфіі і творчай спадчыны святара.

Адзінай працай перыяду 1940–1980-х гг., якая можа прэтэндаваць на ролю навуковага даследавання, з'яўляецца тэкст Вацлава Пануцэвіча (Папуцэвіча) «Ксёндз Вінцэсь Гадлеўскі. Дзяржаўны муж і павадыр народу», надрукаваны ў чыкагскім часопісе «Беларуская царква» ў 1965 г.[1] Аўтар артыкулу, які ў 1936–1939 гг. з'яўляўся супрацоўнікам В. Гадлеўскага, самаахвярна працаваў над біяграфіяй ксяндза, сабраў цікавыя матэрыялы ад прадстаўнікоў беларускай эміграцыі, аднак слабая дакументальная база даследавання (В. Пануцэвіч абапіраўся галоўным чынам на вусныя сведчанні і міжваенную прэсу, якую можна было адшукаць за акіянам), адсутнасць спецыяльных навыкаў і безумоўная ідэйная заангажаванасць аўтара дазваляюць ахарактарызаваць яго працу ў лепшым выпадку як «дакументальны нарыс». Яшчэ больш прыкра, што В. Пануцэвіч, намагаючыся быць аб'ектыўным, амаль не ўклаў у сваю працу асабістых успамінаў і рэфлексій пра В. Гадлеўскага, што магло б стаць, безумоўна, найбольш каштоўнай часткай даследавання.

У незалежнай Беларусі палеміка вакол асобы В. Гадлеўскага працягваецца. Праўда, вядуць яе ўжо галоўным чынам

нацыянальна арыентаваныя навукоўцы і датычыць яна перадусім ступені ўдзелу ксяндза ў антыфашысцкім супраціве і стварэнні Беларускай незалежніцкай партыі[2]. Але дасюль, так сама як і ў пасляваенныя гады, не пабачыла свет ніводная грунтоўная біяграфія ксяндза, ніводзін грунтоўны зборнік яго твораў. І гэта пры тым, што агульная колькасць публікацый пра яго істотна павялічылася[3].

І сёння Вінцэнт Гадлеўскі застаецца аб'ектам ідэалагічнай палемікі. Для адных ён — «рыцар незалежнасці», для іншых — «перакананы германафіл». Афіцыйная беларуская гістарыяграфія па-ранейшаму мае негалоснае табу на тэмы, якія нейкім чынам не ўпісваюцца ў сучасны ідэалагічны канон. Падчас адной навуковай канферэнцыі даследчык гісторыі Другой сусветнай вайны з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксей Літвін сфармуляваў гэты казус наступным чынам: «Напрыклад, Гадлеўскі з пункту гледжання беларускай гістарычнай навукі — няма пытанняў. Рукі ў яго ў крыві? Не. Лічу, што павінны быць навуковыя працы па ўсіх праблемах. Аднак на сённяшні дзень у ВАК[4] яна не пройдзе па шэрагу прычын. Трэба расставіць акцэнты. І яны будуць з часам расстаўлены»[5].

Аўтар гэтай кнігі таксама спадзяецца, што слушныя акцэнты з часам будуць расстаўлены. Як прыклад, індусы шануюць свайго Гадлеўскага — Субхаса Чандра Боса, гэтак жа як Джвахарлала Неру і Махатму Гандзі. У гонар Чандра Боса названы аэрапорт у Калькуце, яму прысвячаюць фільмы і ставяць помнікі. Ён адзін з прызнаных «бацькоў» індыйскай незалежнасці, хаця супрацоўнічаў з немцамі і японцамі, зрабіў, так бы мовіць, няправільную гістарычную стаўку.

Беручыся за біяграфічны нарыс, прысвечаны Вінцэнту Гадлеўскаму, мы не ставілі сваёй мэтай вырашыць усе актуальныя пытанні біяграфіі ксяндза. Сёння гэта, мабыць, пакуль яшчэ

немагчыма. Хацелася ў першую чаргу стварыць партрэт на фоне часу. Але адразу падкрэслім — партрэт гэты ствараўся выключна на аснове гістарычных фактаў. Напрыклад, ніводная з версій забойства ксяндза не набыла ў кнізе такога гучання, быццам гэта ісціна ў апошняй інстанцыі.

Яшчэ адна важная рэч, якую трэба падкрэсліць у прадмове да гэтай кнігі. Вельмі не хочацца, каб Вінцэнт Гадлеўскі быў на сцягах нейкай адной палітычнай плыні ў нашай краіне. Гэта нашмат больш цікавая і шматгранная асоба, вартая нашай памяці і шанавання — і як святар, і як перакладчык Бібліі, і як нацыянальны дзеяч.

# ПАЧАТАК ШЛЯХУ

Сям'я Гадлеўскіх жыла ў Шурычах спрадвеку
*Вінцэнт Гадлеўскі*

Пра дзяцінства, бацькоў і родных Вінцэнта Гадлеўскага вядома даволі мала. Галоўнай крыніцай звестак з'яўляецца аўтабіяграфія ксяндза, надрукаваная ў «Беларускай крыніцы» — газеце беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў[6]. Свае ўспаміны В. Гадлеўскі, на жаль, давёў толькі да 1921 г. (хаця газета і абяцала працяг у наступных нумарах), аднак дзяцінства, гады вучобы і пачатак грамадска-палітычнай дзейнасці ён апісаў даволі падрабязна. Апрача гэтага з надрукаваных крыніц можна карыстацца апублікаванай В. Пануцэвічам у чыкагскім часопісе «Літва» нататкай арганіста Станіслава Васюкевіча, земляка ксяндза. На гэтым вельмі кароткім, менш чым на тры старонкі, аднак змястоўным сведчанні, а таксама на асобе яго аўтара варта спыніцца больш дэтальна, паколькі да сказанага ці напісанага С. Васюкевічам нам давядзецца вяртацца яшчэ не адзін раз. Нататка «Пра ксяндза Гадлеўскага» была надрукавана В. Пануцэвічам у 1969 г., датавана ж яна 2 лютага 1966 г.[7] С. Васюкевіч паведамляе шэраг важных фактаў пра сям'ю ксяндза, а таксама апісвае апошнія гадзіны жыцця В. Гадлеўскага, сведкам якіх ён з'яўляўся. Ён згадвае сваю су-

стрэчу з маці ксяндза ўжо пасля яго забойства[8]. Апрача аўтабіяграфіі В. Гадлеўскага і нататкі С. Васюкевіча, некаторыя факты пра сваякоў ксяндза аўтару гэтага тэксту ўдалося даведацца ад яго аднавяскоўцаў падчас наведвання Шурыч летам 2008 г.[9]

Вінцэнт Гадлеўскі нарадзіўся 16 лістапада 1888 г. у вёсцы Шурычы Баярскай (пазней — Поразаўскай) гміны Ваўкавыскага павета ў сям'і Яна Гадлеўскага і Кацярыны з роду Дзямянчыкаў (радавод Гадлеўскіх у дадатку). Прозвішча Гадлеўскі амаль адназначна паказвае на сувязь рода з населеным пунктам Годлева (*Godlewo*). На абшарах былой Рэчы Паспалітай некалькі паселішчаў з такой назвай вядома на паўночным Падляшшы, у ваколіцах Граева, Вострава і Марыямпаля[10]. Усе яны раней знаходзіліся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага, і менавіта адтуль (а большасць паселішчаў з назвай Годлева — шляхецкія аколіцы) дробныя шляхцічы Гадлеўскія маглі перасяліцца ў ваколіцы Поразава. Ваўкавыскі гісторык Мікалай Быхаўцаў мяркуе, што на Поразаўшчыне на пачатку XIX ст. існавала як мінімум дзве лініі Гадлеўскіх: адна шляхецкая, з вёскі Масушын, а другая сялянская — з Шурычаў[11]. Спадзяемся, што гэтыя здагадкі некалі будуць пацверджаны ці абвергнуты гісторыкамі, аднак не выклікае сумневу, што шляхецкае мінулае (калі яно ўсё ж такі мела месца) продкаў В. Гадлеўскага забылася за шмат дзесяцігоддзяў да нараджэння ксяндза, а сам ён ганарыўся сваім сялянскім паходжаннем і шанаваў працу на зямлі як самы ганаровы занятак: «Сям'я Гадлеўскіх жыла ў Шурычах спрадвеку. У Паразоўскіх парахвіяльных актах спатыкаецца яна перад 1700-х гадоў»[12].

Поразаўская зямля, а суцэльна каталіцкія Шурычы ўваходзілі і ўваходзяць цяпер у склад парафіі ў Поразаве, — цікавы куток Гродзеншчыны. Гэта паўднёвая частка пояса каталіцкіх парафій, якія цягнецца праз усю Ваўкавышчыну

ад Белавежскай пушчы на поўдні да Нёмана на поўначы (парафіі Поразава — Мсцібава — Гнезна — Ваўкавыск — Рось — Рэпля — Воўпа — Лунна). Гэта — парафіі пераважна з так званым старакаталіцкім насельніцтвам, што паўсталі яшчэ ў XV–XVI стст. у якасці цэнтраў рэлігійнага жыцця балцкага насельніцтва, якое канчаткова славянізавалася яшчэ ў познім Сярэднявеччы. Тым не менш, успамінаючы аб Шурычах свайго дзяцінства, В. Гадлеўскі адзначаў на сваёй малой радзіме і адчувальныя палескія ўплывы: «Вёска Шурычы — тыповая беларуская. Аднак носіць на сабе пячаць паўднёвых уплываў: хлявы і гумны ня так збудаваны, як у паўночнай Беларусі, крыты яны болей на спосаб украінскі, на ўсе чатыры бакі, бяз шчытоў. Дык выглядаюць вельмі арыгінальна. Гутарка ў Шурычах таксама ня маець таго шырокага аканьня, якое спатыкаем далей на поўнач, каля Ліды, Маладэчна і Дзісны. У нас кажуць: дзядзько, Ясько, бацько і г.д. Ёсьць таксама саўсім адменныя словы, як: судашаць (спатыкаць), устаўне (заўсёды) і шмат іншых. Мова Шурыч — гэта будзе тая мова, якую мы відзім у зборніку Федароўскага “Lud Białoruski”»[13].

Услед за В. Гадлеўскім падкрэслім таксама і цікавую прыроду ваколіц яго роднай вёскі. Літаральна ў ста метрах за агародамі шурычаўцаў і сёння ўздымаецца цёмная сцяна Белавежскай пушчы, з іншага боку вёску адгароджвае ад палёў Ваўкавышчыны чарада пагоркаў, дзе пачынаецца Рось, што ўпадае ў Нёман, і Нараў, воды якога плывуць у Віслу.

У Шурычах даўно няма той курнай хаты, дзе маленькі Вінцэнт, як ён сам пасля згадваў, год пасля нараджэння качаўся ў дыме. Родную хату Вінцэнта Гадлеўскага спалілі ў 1915 г. казакі, якія, адступаючы перад немцамі, пакідалі пасля сябе «выпаленую зямлю». На яе месцы дзядзька «ксендза» (у Шурычах гавораць менавіта «ксендз», а не «ксёндз») Адам Гадлеўскі яшчэ недзе ў пачатку 1920-х гг. паставіў новую хатку. Менавіта

яна, прыстасаваная зараз адным з вяскоўцаў пад сталярную майстэрню, была для ксяндза прыстанішчам падчас яго прыездаў на радзіму ў 1920–1930-х гг. Сёння гэтая хата — бадай што адзіны матэрыяльны напамін пра слаўны некалі далёка па-за поразаўскай парафіяй род сталяроў Гадлеўскіх[14].

Дзед Вінцэнта Габрыель меў толькі «паўвучастка» зямлі і падзяліў яго паміж трыма сваімі сынамі, сярод якіх быў і Ян. «Вучастак» зямлі быў нормай, якой надзялялі сялян пасля рэформы 1861 г. і якая залежала ад колькасці і якасці зямлі ў той ці іншай вёсцы. Шостая частка «вучастка», што дасталася Яну Гадлеўскаму (па звестках С. Васюкевіча, бацька ксяндза меў не больш за два гектары зямлі), не давала селяніну ніякай магчымасці пражыць з земляробскай працы, таму ён пайшоў вучыцца на сталяра. Пражыўшы нейкі час у Варшаве і атрымаўшы там навыкі прафесійнага рамесніка, Ян Гадлеўскі вярнуўся ў Шурычы і хутка стаў там знакамітым майстрам, «...шырока й далёка быў ведамы як мастак-майстра столяр-стэльмах. Выконваў па касьцёлах алтары, амбоны, спавядніцы і іншыя работы»[16]. Цікава згадаць, што аднавяскоўцы ксяндза адзначаюць вялікія здольнасці ўсіх Гадлеўскіх як да рамесніцкай, так і да разумовай працы: «...ксёндз быў надта здольны да навукі чалавек. Але ўсе Гадлеўскія былі здольныя да ўсяго, і да навукі, і да работы»[17]. Зробленымі дзядзькам ксяндза шафкамі і столікамі і зараз ганарацца многія шурычаўцы.

Сёння ў Шурычах няма ніводнага жыхара з прозвішчам Гадлеўскі. Частка сваякоў пасля апошняй вайны пераехала ў Польшчу. Дзядзька ксяндза Адам, які не меў дзяцей, памёр прыкладна ў 1960-х гг. Нашчадкі ж пляменнікаў і пляменніц Вінцэнта Гадлеўскага жывуць па ўсёй Беларусі (Вінцэнт быў старэйшым сынам у сям’і, апрача яго ў бацькоў было дзве дачкі — Броня і Пэля, а таксама глуханямы брат, які жыў у старэйшай сястры). Затое ў Шурычах жывуць сваякі В. Гад-

леўскага па лініі маці і бабулі па бацьку, якая паходзіла з роду Гуштынаў[18].

Ян Гадлеўскі як сталяр-прафесіянал зарабляў даволі добра і вырашыў паклапаціцца аб адукацыі свайго старэйшага сына. Гэтай мэце з пэўнага моманту ён падпарадкаваў усё сваё жыццё. Няма сумневу, што асоба бацькі адыграла ў жыцці аднаго з лідараў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху вырашальную ролю. Праз шмат гадоў В. Гадлеўскі ўспамінаў пра свайго бацьку: «Быў гэта вясковы інтэлігент, добра граматны і ад прыроды абдароны нейкай удумчывасьцяй і ахвотай да разважаньняў. Чалавек чыстай душы і справядлівага жыцьця, быў моцна рэлігійным і начытаным у сьв. Пісаньні. Знаў таксама гісторыю, розныя гістарычныя падзеі яго моцна цікавілі. Калі паўстаў беларускі рух, мой бацька прыльгнуў да яго шчыраю душою і стараўся пашыраць. Бывала, стане ў Парозаве зь “Biełarusam” у руках і чытае, а каля яго цэлая грамада людзей. Слухаюць, дзівяцца з “простай” газэты, а бацька выкладае мэты і патрэбы беларускага руху. Калі я падрос, быў ён ня столькі бацькам мне, сколькі прыяцелям і таварышам. (...) Дзіўлюся я цяпер зь ягонага пэдагогічнага такту і зразуменьня маёй маладой душы»[19]. Ян Гадлеўскі быў найлепшым дарадцам ксяндза і пасля смерці, бо пры любой магчымасці, асабліва ў хвіліны цяжкіх выпрабаванняў, Вінцэнт наведваў магілу бацькі.

У пошуках працы Ян разам з сям’ёю часта мяняў месца жыхарства. Некалькі гадоў Гадлеўскія пражылі ў вёсцы Броўск у Белавежскай пушчы, пазней пераехалі ў Поразава, дзе ў 1899 г. Вінцэнт скончыў народнае вучылішча. Каб вучыць сына, бацька прадаў маёмасць у Поразаве і пераехаў у Варшаву, дзе да 1903 г. В. Гадлеўскі скончыў тры класы гімназіі. Гэта, дарэчы, даволі рэдкая з’ява для будучых беларускіх каталіцкіх святароў, паколькі большасць з іх праходзіла курс гімназіі за-

вочна. У далейшым з-за матэрыяльных праблем сям'я пераехала спачатку ў Коўна, а пасля вярнулася ў Шурычы.

Тут Вінцэнту прыйшлося дапамагаць бацьку па гаспадарцы — сям'я павялічылася, а ён быў старэйшы з дзяцей. Ян Гадлеўскі займаўся сталярнымі працамі, сын жа ў гэты час даглядаў хатнюю жывёлу і гаспадарку. Аднак трэба было вучыцца далей, і Вінцэнт на працягу двух гадоў працаваў «дарэктарам» — збіраў вясковую дзятву і навучаў, беручы па рублі за навучанне аднаго дзіцяці. Гэта дазволіла сабраць неабходную суму, каб восенню 1905 г. паехаць у Гродна і, правучыўшыся ў тамтэйшай гімназіі да вясны 1906 г., здаць экзамен за чатыры гімназіяльныя класы.

Малады беларускі вясковы хлапец, паслухмяны сын сваіх бацькоў, Вінцэнт, хутчэй за ўсё, трымаўся адасоблена ад іншых гімназістаў, якія акурат у гэты час прынялі вельмі актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях. Трэба было спачатку рэалізаваць сваю мару аб добрай адукацыі, якую так хацеў даць яму бацька і якая, здавалася тады, дасць яму разуменне сутнасці жыцця і ўнутраную гармонію. Грамадскія і нацыянальныя пытанні мала цікавілі Вінцэнта Гадлеўскага нават і ў пазнейшыя гады. Згадваючы час свайго навучання ў семінарыі ў Вільні, ксёндз пісаў: «Усе імкненьні мае былі тады скіраваны да таго, каб для сябе здабыць веду, пазнаньне жыцьця і шчасьце, але аб чалавецтве я мала помніў. Думалася мне, што разважыўшы рэлігійныя і філёзафічныя пытаньні я буду шчасьлівы і гэтым шчасьцем надзялю людзей»[20]. Тым не менш, падзеі, якія страсянулі Расійскую імперыю ў 1904–1907 гг., не маглі прайсці міма яго: «...дзякуючы японскай вайне і наступіўшай за ей рэвалюцыі, я моцна заінтэрэсаваўся палітыкай і грамадзкімі справамі. Як японская вайна дала мне пачатак палітычных пазнаньняў, так расейская рэвалюцыя 1905–1906 году ўвяла мяне ў лябірынт грамадзкіх загадак. Маючы перад сабою

і за сабою гаротнае жыцьцё маіх блізкіх, і зноў-жа гледзячы на багатае жыцьцё варшаўскіх фабрыкантаў і вясковых двароў, я праймаўся нядоляй першых і шчасьцем апошніх і стараўся сваім малажавым розумам разьвязаць загадку няроўнасьці людзкога бытаваньня»[21]. Тым не менш, пакуль гэта былі толькі тэарэтычныя разважанні.

Пасля здачы экзаменаў за чатыры класы гімназіі перад Вінцэнтам паўстала праблема выбару, з якой у той час сутыкаліся многія сялянскія дзеці. Адукацыя сама па сабе мала што давала селяніну, трэба было ўладкоўвацца на працу. Каго ж не задавальняла пасада паштовага служачага або каморніка, той сутыкаўся з праблемай: трапіць на вучобу ва ўніверсітэт было амаль немагчыма, атрымаць адукацыю народнага настаўніка ў настаўніцкай семінарыі мог толькі праваслаўны. Заставалася каталіцкая духоўная семінарыя ў Вільні, адкуль у перспектыве можна было пайсці на вучобу ў каталіцкія вышэйшыя навучальныя ўстановы ў Пецярбургу і за мяжой. Выбар святарскай дарогі ў тыя часы не быў нечым незвычайным і, як правіла, актыўна падтрымліваўся сям'ёю, бо мець сына-ксяндза заўсёды было вялікім гонарам — на ўсю вёску і нават парафію.

Тым не менш бацькі не «ціснулі» на свайго сына. Вінцэнт прыняў рашэнне стаць святаром самастойна і меў час яшчэ добра абдумаць усю справу, бо хаця і паступіў у семінарыю ў 1907 г., аднак змушаны быў яшчэ цягам года ў якасці кандыдата чакаць запрашэння на вучобу.

Наўрад ці бацькі аднаго з будучых лідараў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, благаслаўляючы яго на святарскую дарогу, здагадваліся, што выбар ягоны не толькі не зробіць жыццё іх сына прасцейшым і выгоднейшым, а наадварот, пераўтворыць іхняга Вінцука ў спадарожніка і суперажывальніка ўсіх тых пакут, якія прыдзеццаператрываць беларусам у наступныя крывавыя дзесяцігоддзі.

Вінцэнт Гадлеўскі пісаў, што ў віленскую семінарыю ён трапіў ужо свядомым беларусам і на першым курсе запісаўся ім. Аднак адразу ж далей чытаем у яго аўтабіяграфіі: «Але нацыянальнае пытаньне мяне тады не інтэрэсавала. Болей цікавілі мяне філязофія, тэалёгія, пры помачы якіх я стараўся разважаць загадкі пачатку, канца і мэты людзкага і ўсесьветнага быраваньня...»[22]. Таму няма нічога дзіўнага, што ў 1912 г., з'яўляючыся семінарыстам чацвёртага года навучання, Вінцэнт Гадлеўскі запісаўся палякам[23]. У адрозненне ад сваіх на некалькі гадоў малодшых калег (напрыклад, Адама Станкевіча, Язэпа Рэшаця, Міхала Борыка), якія ўжо на першым курсе семінарыі пачалі актыўную беларускую працу, чыталі беларускія выданні, падтрымлівалі кантакты з рэдакцыяй «Нашай нівы», Вінцэнт Гадлеўскі яшчэ не бачыў патрэбы ў дакладным нацыянальным самавызначэнні, а найбольшую ўвагу надаваў вучобе (пасля ён, адзін з нямногіх ксяндзоў-беларусаў, абараніў у духоўнай акадэміі магістарскую дысертацыю). Дарэчы, гэта добра адлюстроўвае той факт, наколькі імкліва расла беларуская нацыянальная свядомасць у каталіцкім асяроддзі напярэдадні Першай сусветнай вайны.

Пачынаючы з перыяду пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. каталіцкі касцёл у Расійскай імперыі знаходзіўся ў стане пастаяннага канфлікту з дзяржаўнай адміністрацыяй. Расійскія ўлады ўжывалі жорсткія рэпрэсіўныя адміністрацыйныя метады ў барацьбе з касцёлам. Закрываліся каталіцкія храмы (каб пазбавіць былых уніятаў, а цяпер праваслаўных, «польскага» ўплыву), падвяргаліся рэпрэсіям вышэйшыя каталіцкія іерархі, звычайныя святары і манахі, рабіліся даволі бязглуздыя і несістэматычныя спробы ўвесці ў каталіцкае жыццё рускую мову. Усё гэта не толькі не давала пажаданага эфекту, а наадварот, узмацняла касцёл духоўна. Больш за тое, калі ў час і ў першыя гады пасля паўстання польскую нацыя-

нальную афарбоўку мела рэлігійнае жыццё шляхты і, у пэўнай ступені, мяшчанства, то ўжо ў 1870-х гг. польская самасвядомасць пачала распаўсюджвацца і на сялянства. Гэты працэс недастаткова вывучаны сучаснымі даследчыкамі і дашукацца яго вытокаў не так проста. Напэўна, адной з прычын распаўсюджання польскай нацыянальнай свядомасці сярод беларускамоўнага балцкага або ўсходнеславянскага па паходжанні сялянства сучасных Літвы і Беларусі было вызваленне з-пад прыгону і, як вынік, імклівы духоўны рост былых прыгонных. Чалавек адчуў сябе больш самастойным і пачаў задумвацца аб нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, пачаў шукаць сваё месца ў свеце. А паколькі рэлігійная аснова жыцця селяніна была па-ранейшаму вельмі моцнай, то нацыянальная ідэнтыфікацыя адбывалася па рэлігійнай прыкмеце. Селянін станавіўся «палякам» не толькі таму, што быў каталікам, але і таму, што касцёл цярпеў прыгнёт і яго трэба было бараніць. Свабоднага чалавека, нават простага селяніна, ужо можна было падвяргаць рэпрэсіям, кідаць у турму, адпраўляць на катаргу або нават расстрэльваць, аднак зламаць яго перакананні, асабліва рэлігійныя, было амаль немагчыма. У 1839 г. расійскім уладам дастаткова лёгка ўдалося ліквідаваць Унію ў Паўночна-Заходнім краі менавіта з той прычыны, што асноўная маса ўніятаў належала да ліку прыгонных сялян. Такая ж самая акцыя, што праводзілася ў 1875 г. на Падляшшы (у тым ліку часткова і на Гродзеншчыне) ужо сярод свабодных людзей, не дала аніякага эфекту ў плане русіфікацыі «вернутых у праваслаўе». Усе яны яшчэ з большай зацятасцю лічылі сябе палякамі, а на пачатку XX ст. з Царства Польскага і Аўстрыйскай імперыі на Беларусь ужо пачала пранікаць і польская палітычная прапаганда. Расійская ж улада, якая раней катэгарычна адмаўлялася прызнаць у каталіках беларускае паходжанне (іх запісвалі ў лік палякаў), напрыканцы XIX ст. ужо пачала

шукаць беларусаў-католікаў. Іх, паводле падлікаў царскіх чыноўнікаў, у гэты час на тэрыторыі паўночна-заходніх губерній было каля мільёна чалавек (прыкладна 1/5 ад усяго ліку беларусаў). Няма сумневу, што гаварылі яны часцей за ўсё па-беларуску, а вось ці лічылі яны сябе беларусамі — вялікае пытанне.

Такім чынам, дэкляраванне сваёй польскасці для католіка, а тым больш для будучага ксяндза, было неабходнасцю. Усё гэта, на першы погляд, шчыльна закрывала дарогу да росту беларускай свядомасці сярод каталіцкага насельніцтва і было адной з прычын хранічнага «непаспявання» беларускага руху за іншымі ўсходнееўрапейскімі нацыяналізмамі. Як вядома, адной з галоўных прычын шырокага распаўсюджання нацыянальнай свядомасці сярод сялянскіх народаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы на мяжы XIX–XX стст. была дзейнасць каталіцкага кліру. Ксяндзы ў Літве, Славакіі, Харватыі, Славеніі, уніяцкія святары ў Заходняй Украіне мелі ўплыў на масы нават большы, чым нацыянальная інтэлігенцыя, і адыгралі вельмі істотную ролю ў барацьбе супраць асіміляцыі сваіх народаў[24]. У справе ж фарміравання нацыянальнай свядомасці беларусаў канфесійны фактар, як вядома, меў хутчэй негатыўнае значэнне. Каталіцкі касцёл і праваслаўная царква сталі на Беларусі адпаведна сімваламі польскасці і рускасці, у сваім шматгадовым супрацьстаянні радыкальна дзялілі беларусаў на «праваслаўных-рускіх» і «католікаў-палякаў». Зразумела, што ў такіх умовах духоўныя навучальныя ўстановы належалі да ліку найбольш кансерватыўных у плане дапушчэння якіх бы тое ні было праяў беларускага нацыянальнага руху. Усё гэта можна сказаць і пра Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю, якая, па словах А. Станкевіча, была «цьвярдыняй ня толькі каталіцтва, але ня меньш, калі ня больш, і цьвярдыняй польскасьці»[25].

Сярод клірыкаў семінарыі, якія былі прагнымі да ведаў і шчыра спачувалі долі свайго народа, ужо ў канцы XIX ст.

хуткімі тэмпамі пачала пашырацца беларуская нацыянальная свядомасць. У пераважнай масе выхадцы з сялянскіх сем'яў, заахвочаныя слабой, але ўсё ж такі вельмі важнай у тыя гады падтрымкай такіх значных каталіцкіх іерархаў як Эдвард Роп ці Юрый Матулевіч, яны лічылі сябе беларусамі і спрабавалі нават займацца нацыянальнай дзейнасцю па-за межамі семінарыі. Аднак, як сведчыць А. Станкевіч, у першым дзесяцігоддзі XX ст. «семінарскія ўлады запісвацца Беларусамі клерыкам ня радзілі і нават не дазвалялі. (...) Дзеля гэтага бадай усе клерыкі Беларусы запісваліся тады палякамі»[26]. Можна таксама дапусціць, што справа была яшчэ ў тым, што многія клірыкі-семінарысты глядзелі ў той час на беларускі рух як на падначалены польскаму нацыянальна-вызваленчаму руху і лічылі беларускую прапаганду не больш чым добрым сродкам барацьбы з русіфікацыяй мясцовага насельніцтва. Ім было цяжка аддзяліць сваю нацыянальную свядомасць ад польскасці, таму яны ў асноўнай масе і запісваліся палякамі. Магчыма, такіх жа поглядаў прытрымліваўся на той час і Вінцэнт Гадлеўскі.

Пасля заканчэння семінарыі ў 1912 г. В. Гадлеўскага накіравалі ў духоўную акадэмію ў Санкт-Пецярбургу. Умовы навучання і наогул жыцця ў сталіцы Расійскай імперыі паскорылі нацыянальную эвалюцыю маладога дыякана. У акадэміі В. Гадлеўскі ці не ўпершыню сустрэўся з этнічнымі палякамі, латышамі і нават паволжскімі немцамі. «Усе гэтыя народнасьці мелі ясныя, вырабленыя даўгалетнім змаганьнем з чужынцамі нацыянальныя імкненьні», — пісаў ксёндз пазней[27]. Пад уплывам калег «касцельна-краёвая тутэйшасць з беларускай афарбоўкай» В. Гадлеўскага пачала саступаць месца даспелай нацыянальнай свядомасці.

Паводле звестак А. Станкевіча, у акадэміі ўжо пачынаючы з 1912 г. існаваў нефармальны беларускі гурток, ініцыятарам

утварэння якога быў Люцыян Хвецька[28]. Восенню ж 1913 г. апошні разам з В. Гадлеўскім і А. Цікотам ініцыявалі ўтварэнне афіцыйнага беларускага гуртка. Да іх далучыліся яшчэ некалькі навучэнцаў. В. Гадлеўскі стаў сакратаром суполкі[29]. Праз год яна папоўнілася іх маладзейшымі сябрамі, якія раней ужо заснавалі беларускі гурток у Віленскай духоўнай семінарыі. Гэта былі А. Станкевіч, В. Шутовіч, А. Неманцэвіч, Я. Лупіновіч, П. Хоміч. Пасля гэтага гурток павялічыўся да 11 чалавек (на 70 навучэнцаў) і стаў адным з самых значных у акадэміі. Яго дзейнасць у акадэміі ў першыя гады існавання мела прыкладна тыя ж формы, што і дзейнасць беларускіх клірыкаў у Віленскай духоўнай семінарыі. Была арганізавана бібліятэка, праводзіліся дыскусіі, чыталіся рэфераты[30]. Не меншае значэнне мелі кантакты ксяндзоў з беларусамі з іншых навучальных устаноў, а таксама беларусамі-рабочымі. Адбываліся пасяджэнні петраградскіх беларусаў — у Ф. Будзькі або Б. Эпімаха-Шыпілы. Гэтыя сустрэчы, а таксама розныя мерапрыемствы ў акадэміі наведвалі Б. Тарашкевіч, К. Душэўскі, П. Мядзёлка[31].

Тагачасны Пецярбург ужо даволі працяглы час быў важным асяродкам, дзе гуртавалася беларуская інтэлігенцыя малодшага і старэйшага пакаленняў. Ідэйным кіраўніком і арганізатарам беларускага руху быў прафесар Б. Эпімах-Шыпіла, выдатны беларускі вучоны, які фактычна з'яўляўся дырэктарам універсітэцкай бібліятэкі, выкладаў старажытнагрэчаскую мову ў каталіцкай акадэміі і лацінскую — на агульнаадукацыйных курсах Чарняева.

І беларуская праца, і навучанне ў акадэміі канчаткова пераканалі В. Гадлеўскага ў тым, што ён зрабіў слушны выбар, стаўшы на святарскую дарогу. 9 мая 1914 г. Вінцэнт склаў просьбу пра дазвол на пасвячэнне яго ў святары, што і адбылося 3 чэрвеня таго ж года[32].

Пасля заканчэння акадэміі ў 1916 г. В. Гадлеўскі быў накіраваны ў Мінск. Гэты горад фактычна знаходзіўся на прыфрантавым становішчы, але беларускае жыццё ў ім не спынялася, хаця і вельмі ўскладнялася ваеннымі парадкамі. Ксёндз уліўся ў невялікую беларускую грамаду тагачаснага Мінска, пазнаёміўся з М. Багдановічам, А. Смолічам, П. Алексюком. «Новы 1917 год мы спатыкалі ўжо (на Захараўскай, 18, дзе быў як бы зборны пункт) у даволі вялікай сямейцы. Гаварылі прамовы, укладалі пляны, рыхтавалі выдавецтва, рабілі складкі па падпісному лісту — не спадзяючыся тых вялікіх падзеяў, якія адчынілі перад намі шырокі прастор для працы», — згадваў пасля В. Гадлеўскі[33].